| | |
|---|---|
| Заглавие документа | Пазіцыя дзеяча vs пазіцыя назіральніка ў даследаванні тапонімаў // Шосты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі: працоўныя матэрыялы. Том 6, Каунас, 7–9 октября 2016 г. / редкол. Т. Кур'ян, М. Александровіч [и др.]. – Каўнас : Vytautas Magnus University Press, 2017. – С. 228–232. |
| Авторы | Копач А.І. |
| Тема | Мовазанаўства |
| Дата публикации | 2017 |
| Аннотация | Вывучэнне імёнаў з пазіцый чалавека-назіральніка (А. Л. Беразовіч, М. Э. Рут і інш.) прапануецца дапоўніць выяўленнем паслядоўных рашэнняў чалавека-дзеяча. Пры падобнай змене ракурсу даследавання альтэрнатывай намінатыўнай і пазнавальнай функцыям уласных імёнаў, якія традыцыйна прызнаюцца тапаністамі, будзе аб'яднанне камунікатыўнай і кагнітыўнай функцый. |

Перыяд канца XX–пачатку XXI стагоддзя характарызуецца паступовым пераходам даследаванняў геаграфічных імёнаў да канцэпцыі новага тыпу, у якой больш увагі надаецца функцыянальным, канцэптуальным і камунікатыўным уласцівасцям онімаў. Інфармацыя, якая назапашана ў імёнах, разглядаецца ў такіх працах у плане суаднесенасці імёнаў з каштоўнаснымі кодамі агульначалавечай і этнічнай карціны свету. Пазіцыя намінатара адыгрывае ў іх ключавую ролю.

Інфармацыю, як вядома, можна назапашваць і перадаваць, таму заканамерным бачыцца вылучэнне як мінімум двух аспектаў, у адпаведнасці з якімі ажыццяўляецца пазнанне аб'екта чалавекам і надзяленне яго імем. У сваім дакладзе мы адлюструем асаблівасці аўтарскага падыходу да вывучэння геаграфічных імёнаў, якому будзе папярэднічаць апісанне падыходу этналінгвістычнай школы, які актыўна выкарыстоўваецца лінгвістамі на пастсавецкай прасторы.

Этналінгвісты (Алена Беразовіч, Марыя Рут і інш.) прапанавалі лагічнае абгрунтаванне пазіцыі назіральніка. Для іх важна вызначэнне базавых параметраў ўспрымання прасторы і адлюстраванне ў тапонімах такіх параметраў бачання свету суб'ектам, як праяўленасць / імплікаванасць суб'екта назірання, накіраванасць арыентацыі, каардынуючы механізм, ахоп тэрыторыі, характар счаплення элементаў прасторавай карціны свету, задзейнічанне прасторавай гарызанталі / вертыкалі і г.д. (Березович, 1999: 16–18; Березович, Рут: 33–38).

Як вынік, семантыка-матывацыйны характарыстыкі *элементаў* ўласных імёнаў суадносяцца з дадзенымі этнамоўнай карціны свету, а на пярэдні план даследавання выводзіцца здольнасць мовы захоўваць у сваіх адзінках звесткі аб культуры і светаадчуванні народа.

Абсалютна іншы, інтэграваны характар носіць пазіцыя дзеяча, прапанаваная аўтарам. У ёй аб'ектам увагі аказваюцца такія параметры, як значнасць аб'ектаў пэўнага віду ў шэрагу іншых у тапанімічнай прасторы, здольнасць цэласнага імені

выконваць функцыю арыентацыі на мясцовасці, асаблівасці структуравання імёнаў у *працэсе* маўленчай дзейнасці, захаванне старога ў новым, улік ўзаемаўплываў розных тапанімічных палёў. Дадзены аспект даследавання не атрымаў шырокага ўжывання, хоць даследаванні псіхолагаў сведчаць пра тое, што «маўленне сваім з'яўленнем прынцыпова змяняе свядомасць» (Выготский, 1982: 165).

Важнасць значэння асобных кампанентаў тапоніма для вучонага і для носьбіта мовы розная. Гэта важна для вучонага («інтраверта»), але неістотна для носьбіта («экстраверта»). Логіка пазнання састаіць ў тым, што спачатку чалавек назірае з'яву, вылучае яе асобныя прыметы, якія прыходзяць ад розных аналізатараў, фармуе сваё ўяўленне, толькі пасля гэтага ён спрабуе перадаць сваё разуменне з'явы. Тут мы падышлі да кропкі, дзе пачынаецца спрэчка аб тым, што з'яўляецца раней – пазнанне або камунікацыя. Часта навукоўцы кажуць, што «камунікатыўная функцыя выхоўвае, "расціць" разумовую» (Норман, 1996: 53), аднак у тапанімных даследаваннях больш увагі да гэтага часу надавалася вывучэнню асобных прымет, заўважаных чалавекам у тапааб'ектах. Пры падобнай «атамарнасці» даследавання мы не выходзім за межы зададзенага наяўнай сітуацыяй, а таму аўтаматычна разглядаем чалавека, не ўлічваючы яго здольнасць пераходзіць да ўсё большай дэталізацыі зыходнага прадстаўлення аб аб'екце, з аднаго боку, і да пераходу ад канкрэтна-пачуццёвага пазнання да абстрактнага, з іншага.

Чалавек пачынае працэс пазнання як назіральнік, а працягвае як рэгулятар, камунікатар-дзеяч. Неабходнасць перадаць атрыманую звонку інфармацыю прымушае яго пачаць працэс яе катэгарызацыі – лагічнай апрацоўкі вынікаў пазнавальнай дзейнасці і перавядзення іх у дзейнасць камунікатыўна-кагнітыўную. Мы прапануем звярнуцца да тапанімнай намінацыі як працэсу, звязанаму з фарміраваннем структур свядомасці і мыслення суб'екта ў дзейнасці па намінацыі адзінкавых аб'ектаў уласнымі імёнамі.

У назвах геаграфічных аб'ектаў побач з дыферэнцыятарамі, якія з дапамогай лінгвістычных сродкаў аддзяляюць адно імя ад другога, прысутнічаюць геаграфічныя тэрміны і фарманты (згорнутыя геаграфічныя тэрміны), якія адносяцца да ліку кваліфікатараў. Апошнія дазваляюць пазначыць, да якога віду аб'ектаў (рака, возера і г.д.) ці хаця б да якой з катэгорый (субстантыў, ад'ектыў і г.д.) адносіцца імя: *Глухі Мох, Чарнішня*.

Нягледзячы на больш важную ролю, якую адыгрывае ва ўласным імені дыферэнцыятар, у тапоніме-словазлучэнні галоўную сінтаксічную ролю адыгрывае слова-субстантыў: напрыклад, *рака* (якая?) *Хуткая*. Толькі неабходнасць дэталізацыі прымушае намінатара зрабіць галоўным элементам уласнага імені адзінкавую прымету. Аднак і яна не застаецца без класіфікатара. Такім чынам, улічваць ў даследаванні неабходна не толькі дыферэнцыятар.

Вылучэнне мадэлей у адпаведнасці з нашым падыходам ажыццяўляецца ў кірунку ад элемента-класіфікатара (ядра) да элемента-дыферэнцыятара, што адпавядае логіцы спасціжэння свету і яе адлюстраванню ў маўленні.

Тапонім як функцыянальная адзінка індывідуалізуе аб'ект наймення. Але так здараецца не заўсёды. Геаграфічныя тэрміны беларускай мовы *рака, возера, балота* могуць не вылучаць адзінкавую прымету, але застаюцца здольнымі выконваць функцыю ўласнага імені: *Возера, Горы, Балота*. Гэта мінімальная адзінка, якая існуе ў тапасістэме як паўнавартасны знак (1а).

Другая група назваў, якая не індывідуалізуе (1б), – гэта імёны, якія ўтрымліваюць у сваім складзе геаграфічны тэрмін, што не адпавядае сучаснаму стану аб'екта: *Ржавы Луг* (балота).

Абедзве вышэйапісаныя групы падобныя тым, што пры намінацыі аб'ектаў суб'ект ужывае агульныя і ўласныя імёны, якія існавалі ў мове і да таго часу, як дадзеныя аб'екты атрымалі свае імя.

Тапонімы кшталту *Балота За Сялом, Ціханаўскі Мох* і да т.п. адзначаюць не толькі тып аб'екта (балота), але і даюць яго прымету. Гэта самая прадуктыўная група (2) уласных імёнаў, яе "сярэдні клас". Дадзеная група, дарэчы, вызначае дамінуючы погляд на онімы як адзінкі, сутнасць якіх вызначаецца праз матывуючую аснову, спасылку на ўласцівасць ці з'яву, якія характарызуюць аб'ект. Як можна заўважыць з прыкладаў, гэта не заўсёды адпавядае рэальнаму статусу ўсіх тапонімаў сістэмы.

Імёны, рэферэнты якіх захавалі "жывыя" сувязі дзякуючы свайму становішчу побач з аб'ектам ці якія некалі былі разам часткай аднаго вялікага аб'екта, што падзяліўся на некалькі асобных частак, атрымліваюць другасны дыферэнцыятар: беларус. *Мох* > *Мох 1, Мох 2*; *Нязнанава* > *Бальшое Нязнанава*.

Дадзеныя тры мадэлі аказваюцца «працоўнымі» абсалютна ва ўсіх тапанімных палях, а іх суадносіны ў кожным з палёў лёгка паддаюцца пазамоўнай інтэрпрэтацыі. Яны суіснуюць у сістэме, прычым складаныя знакі ўтвараюцца з простых. Пераход ад першай мадэлі магчымы як да другой (*Мох* > *Антонаў Мох*), так і да трэцяй (*Мох* > *Мох 1, Мох 2*).

Такім чынам, даследаванне імёнаў з пазіцый намінатара-дзеяча ўключае тапонімы ў камунікатыўны кантэкст, надае менш увагі энцыклапедычнаму значэнню імёнаў і больш – выяўленню метапраграм стварэння імёнаў геаграфічных аб'ектаў у працэсе камунікацыі. Як вынік змянення ракурсу даследавання, увага ў большай ступені надаецца канструктывісцкаму характару трансфармацый тапазнакаў з улікам змянення кантэксту іх ужывання ў межах дадзенай тапасістэмы, а ролю асноўнай функцыі займаюць звязаныя адна з адной кагнітыўная і камунікатыўная функцыі.

## БІБЛІЯГРАФІЯ

1. Березович, Елена (1999) *Русская топонимия в этнолингвистическом аспекте: Автореф. дис. ... д-ра филол. наук: 10.02.01*. Екатеринбург: Урал. гос. ун-т им. А.М.Горького.

2. Березович, Елена и Рут, Мария (2000) "Ономасиологический портрет реалии как жанр лингвокультурологического описания", *Известия Уральского государственного университета*, 17: 33-38.

3. Выготский, Лев (1982) "Проблема сознания. Запись основных положений доклада Л. С. Выготского", Александр Лурия, Михаил Ярошевский (ред.), *Собрание сочинений в 6-ти тт. Т. 1. Вопросы теории и истории психологии*. М.: Педагогика.

4. Норман, Борис (1996) *Основы языкознания*. Минск: Бел. Фонд Сороса, 1996.